Цэна асобнага нумэру 5 кап.

# НАША НІВА

Выходзіць што тыдзень

Адрэс рэдакціі і адміністрацыі: Вільня, Віленская вул., № 29

Цэна с перасылкай і дастаўкай на 1 г. 2 р. 50 к., на 6 мес.—1 р. 25 к. на 3 м.—65 к., на 1 мес.—25 к. За граніцай: на 1 г.— 4 р. на 6 мес —2 р. 3 мес. —1 р. Перамена адрэсу— 20 кап.

Абвесткі прыймаюцца на апошняй страніцы па 20 кап. за лінейку малымі літэрамі Рукапісы і карэспандэнціі, прысланые у рэдакцію, павінны быць чытэльна напісаны с праўдзівай фаміліей і адрэсам таго хто яе прысылае. Можна таксама падпісаць прозвішча разам з фаміліей„ хто не захочэ каб была надрукавана праўдзівая фамілія Адрэс і фамілія толькі для ведама рэдакціі. Рукапісы аўторам не вертаюцца назад

Год IX. 27 Марца 1914 г. № 15

## Важная справа.

У штодзеннай цяжкай працы дзеля куска хлеба, калі едкі пот залівае вочы мужыку-хлеbabаробу, чэлавек не бачыць нічога апрача тэй зямлі, катору гарэ, ў катору ўлажыў усе сілы свае. І здаецца яму, бытцым жыцьцё клінам зыйшлося на яго шнурочку, бытцым усё шчасьце чэлавека ўся доля яго тут захована. Вока, прывыкшае глядзець уніз — у зямлю, ня можэ агарнуць шырокаго сусьветнаго прастору, не бачыць іншых бакоў жыцьця апрыч сваей работы на ральлі, апрыч вечнаго шуканьня хлеба.

Аднак жыцьцё шмат шырэй, шмат багацей за ўсё тое, што змешчаецца ў вузкім кругазоры селяніна. Шуканьне хлеба — гэта толькі адзін бок нашаго жыцьця; ён ня можэ і непавінен закрываць іншых спраў, каторые з ім звязаны дый на ім усе дзержацца. А звязаны з ім перш-на-перш справы грамадзянскіе і палітычные

Палітычнае жыцьцё, організованае жыцьцё вялізнай грамады людзкой мае мэту здаволіць *усе* нялічэные патрэбы кожнаго чэлавека і ўсяго народу. Але гэтая мэта бадай, ніколі не спаўняецца: у грамадзкім жыцьці дужэйшые пануюць над слабейшымі, ды яны заўсёды патрапляюць захапіць у сваі рукі палітычную ўласць, каб як найлепей устраіваць *свае* асабістые справы, прыдбаць як найбольш карысьці для сябе —хаця-бы чужым коштам.

З гэтаго бачым, што шуканьне хлеба — гэта ня толькі праца на ральлі. Ужо дзеля самай тэй працы перш трэба мець *доступ да гэнай ральлі*. Пасьля — трэба умець працаваць і мець с чым пачаць, значыць — *мець навуку*, сякі-такі *капітал і прылады да работы.*

Чэлавек жыве не адным толькі хлебам: чым вышэй яго культура, тым болей патрэб ён мае —патрэб для душы і для цела. Вось і трэба, каб уся *краса сьвету* ўсё *культурнае багацьце* яго, створэнае людзьмі, ускормленымі тым-жэ хлебам мужыцкім,—каб усё гэта было *даступна кожнаму*, каб наш гаротнік быў не машынай, ці жывёлай рабочай, а вольным і культурным *чэлавекам-грамадзянінам.*

Каб усё гэта забаспечыць народу, патрэбен справядлівы, добры лад у старане. Патрэбен лад, пры каторым дужэйшые не карысталібы с цямноты сваіх слабейшых братоў, каб усе грамадзяне мелі *роўные палітычные правы.* Аб такую роўнасць ідзе і ў нас змаганьне. Ідзе яно і ў Думе, і за Думай — у штодзенным жыцьці. А поруч с тым, як працоўны народ памалу, але безупынна здабывае палітычные правы і пачынае падыймаць свой голас у справах палітыкі,— іншые станы, каторые дагэтуль кіравалі і ешчэ кіруюць палітычным жыцьцём дзержавы, ня хочуць зыйсьці з сваіх мейсц, надта для іх выгодных.

Яркі прыклад дае „злучэная шляхта“ расейская. Гэты хаўрус «правых» прэдстаўнікоў шляхоцкаго стану робіць вялікі націск на урад, каб у Расеі выдаваліся толькі такіе законы, каторые карысны для шляхты. Пад яго націскам і Гасударствены Савет гэтымі днямі урэзаў права накладаць падаткі на ўсіх жыхароў будучай усестановай воласьці, каб на валасные патрэбы не прыйшлося плаціць грошы і паном. І так робіцца на кожным кроку...

Каліб селяне мелі добрых дэпутатоў у Гас. Думе, дык тые баранілі-бы іх справы ад уселякіх напасьцей. Але, як ведама, выбіралі мы дрэнна, дый закон аб выбарах дэпутатоў ня лішне карысны для селян. Дык німа надзеі, каб сыны нашай вёскі паклапаціліся аб сваіх братох, седзючы ў Думе. За тое ня трэба кідаць іншай надзеі: надзеі, што раней ці пазней народ наш пасьвятлее, што так ці гэтак ён дачэкаецца поўных грамадзянскіх правоў. Але дзеля гэтаго патрэбна йшчэ аграмадная праца. Каб жэ зрабіць тую працу хапіло нам сілы і уменьня, трэба, *каб народ пільна прыслухіваўся да палітычнаго жыцьця Расеі*, каб добра пазнаў, хто ідзе разам з ім, а хто проці яго, каб ведаў акуратна, якіе правы і якіе рэформы будуць для яго, найбольш карысны. Толькі тады мы ўсе здалеем прылажыць сваю руку да будаваньня новаго жыцьця і аткрыцьця новай дарогі да здабыцьця штодзеннаго куска хлеба.

Г. Б.

## Беларуская цемната.

Што можна падумаць і сказаць аб людзях, каторые-б прыйшлі ў гай, дзе растуць поўные жыцьця і сілы дзярэўя; прыйшлі, пакалечылі іх, паламалі, а потым бы гаварылі: „Які дрэнны гай, якіе паганные дзярэўя! Стаяць не растуць, толькі мейсцо займаюць“.

Ці ня тое самае гаворуць і цяпер усе тые, хто вінуе нашаго беларуса, называе яго цёмным, заскарузлым, нерухомым, застыўшым у сваім развіцьці? А колькі такіх нарэканьнёў прыходзіцца чуць і цяпер! Я ня буду даводзіць, што

## ПЕРШЫНКА.

Анцік апошні у маткі і самы маленькі у хаці. Хлапчына ён жвавы, але у зімку нікуды ня ходзіць, бо німае ні лапцёў, ні ўласнай вопраткі. Цалюткі дзень сядзіць дома,— круціцца, сьвішчэ, сьпевае і гасае па лавах, як па шырокай прасторнай дарозі.

Ешчэ летась ён бегаў бяз портак і не саромяўся, а сяголета стаў скардзіцца матцы, што яму ўжо брыдка у голай сарочцы. Даводзючы гэта, нават збрэхаў, бо дзеўчаты з яго не сьмеяліся, — ды й начхаў бы ён на іх выскаляньня, — а тымчасам жальбу павёў так, што каб не дзявочы, моў, сьмех, дык-бы і портак ня трэ было

З дзеўчат ён сам насьміхаўся, а ў гульнях камандаваў імі, як певень курамі. Падчас наўмысля зневажаў іх і біўся, каб усе бачылі і ведалі, што з дзеўчатамі ён не кампануе і нічога супольнаго німае Сваю вайну з дзявоцтвам распачаў ён с тых пор, як пасварыўся з Друкаровай Амількай. Уласна кажучы, дык гэта і не сварка была, а так нешта некае, на што й назвы не дабярэш.

Друкарова Амілька яго равесьніца, а мо крошку й старэйшая. Дзяўчынка яна слухняна і разумная. Сініе вочкі яе блішчаць і вабяць, як два васілёчкі ў полі, а вялікіе й таёмные, як паўночнае неба. На іх глядзіш, як у цёмны калодзізь, або на дно цёмнай вады, дзе адбіваюцца і зоры і неба, і хмары. Часам прыгледзішся, узірнешся, дык аж вусьцішна робіцца. Здаецца нейкі туман ля іх ўецца, ні то праменьні мігацяцца. Анцік узяў раз ды дакрануўся пальцамі да яе воч, а Амілька замарокавала, натапырыла губкі ды сказала:

— Які ты нягодны,—пыркаеш у вочы!..

Анцік ёй спадабаўся, і хутка яны ссябраваліся. Бывала зыйдуцца, трымаючы пальцы ў році, пасядуць на прызбі, гуляюць ды пазіраюць адно на адно, як маладые целяты на новые вароты.

Раз Амілька ткала пояс, а Анцік поркаў землю пальцам ды глядзеў. Пояс яму спадабаўся, хацелося пахваліць, але каб зрабіць гэта, дык ён распачаў гаворку здалёк Першна-перш запытаўся:

— Чаму вас дражняць Друкарамі?

— Ня ведаю, адказэла Амілька: мо за тое, што ў нас вокны памаляваны. . А ласьне гэта кепска спытала яна.

— Дык нёж не! Вунь на цябе кажуць Друкарыха, адказаў Анцік, а далей спытаў:

— Хто цябе навучыў паясэ ткаць?

— Мама.

— А мяне мама ня вучыць ..

— Дык ты-ж хлопец, засьмеялася Амілька,—а гэта дзявочая работа.

Анцік памаўчаў трошкі, далей пагладзіў пальчыкам пояс ды неяк саромліва сказаў:

— Пекняныкі... як галінка.

— Дальбо? зрадзела Амілька. Дык я табе яго падарую, як кончу ткаць.

Пасуліла нябога-ды й вочкі вытрашчыла. Анцік як чорта угледзіў. Ен раптам схапіўся, азірнуўся ды драпануў ад Амількі, аж пяты яго заласкаталі.

— Ніхай ты згары с сваім поясам! —адказаў ёй Анцік уцекаючы — Крый Божэ дазнаюцца—прасьмяюць: Друкаром прадражняць, мая палюбоўніца — скажуць.

С таго часу ён адцураўся сяброўства з Амількай, не ўзлюбіў дзеўчат і стаў мсціцца...

Дзявочы сьмех дадаў ён дзеля таго, каб матка не спрэчалася ды каб хутчэй рупілася пашыць яму порткі. І мяркуючы гэта, не памыліўся бэсты, бо маці запраўды спачатку ня слухала, а толькі гладзіла па галоўцы ды прасіла, дакляруючы:

— Пачэкай, каток! Вось ухаджуся з работай, дык пашыю табе і порткі, і крамную кашульку...

Але ні такоўскі быў Анцік, каб распачаўшы справу, кінуць ня скончыўшы.

— Ня трэ' мне кашулі, мне трэба порткі, адказаў ён матцы,—ды тхнуць нідаў, покі яна не згадзілася ды не ўзялася за шытво

Неяк у вечэр, пры лучніку, разлажыла яна сваё швацкае начэньня, узяла кусок паска, змерыла у яго паясьніцу і ногі ды пашыла першые порткі с старой перэтыканай спадніцы. Ні за тым, ёсць ведама, што не было с чаго, альбо пашкадавала палатна, ці што іншае,—не,—кроючы порткі с старой спадніцы, яна кіравалася тэй мэтай, што ўсё-ж роўна за тры дні парве, або дзе згубіць на беразі. Матка нацешыцца з яго не магла і каб мага, дык на дрожджах здаецца гадавала-б яго, абы хутчэй рос ды ставаў на ўласные ногі...

Увесь час, покі матка шыла, Анцік не адыходзіўся ад яе. Сеўшы на кукішках, ён вока ня зводзіў с шытва, — ня соп, не варушыўся, паводзіў галоўкай за ніткай ды нават рупіўся памагчы, стаць матцы у прыгодзі.

— Дай, мамка, я зацягну нітку,—ў мяне вока вайстрэйшае.

І маці аддавала іголку яму, а сама цярпліва чэкала, покі ён длубаўся з ніткай. А длубаўся ён доўга, бо ўвесь дрымацеў, дрыжэў і спешаўся. Як на задор, нітка слізгала міма, згібалася і не хацела лезьці у вушка. Урэсці, з дапамогаю маткі, нітка зацягвалася. Анцік урачыста падымаў голку за нітку, сьмеяўся і казаў:

— Во яна,—як плотка на вудзі!

Скончыўшы матка прымерыла. Вышлі ня порткі, а чыстые майткі, ня згорш за крамные. Каб бачыў Бэрка-кравец, дык бы напэўна сказаў: „Хва! Вот табе й Несьвіж!“ Несьвіж Бэрка не любіў, бо яму пастаянна калолі вочы, што у Несьвіжы лепшые за яго краўцы.

Порткі былі с падцяжкамі, з блішчастым масянжовым гузікам і с чырвонаю, як жар, паясьніцаю. Матка наўмысьля аздобіла іх чырвонаю рызаю, справядліве гадаючы, што чырвонаму кожэн блазан рад. Зірнуўшы на паясьніцу і пекны, у дробную клетачку рабенькі, як зязюля, коляр порткаў, Анцік гадаў, што гэткіх слаўных майтак і шляхціц ні мае. І рад быў, леўка, як на сьвет нарадзіўся.

...Добра дзіцятку! С чырвонай латкі радзее яно! А вырасьце, зробіцца сталым, дык

такое абвінавачэньне цэлаго народу ні мае пад сабою грунту. Што беларус ешчэ цёмны, гэта— праўда; але што ён застыў на мейсцы, не варушыцца, ня будзіцца ад летаргічнаго сну—бо цэлы рад вякоў жыцьця беларускаго народу іначэй ня можна і назваць, як яго хворасьцю, — гэта глыбокая няпраўда, незнаньне беларускаго быту і руху за апошніе часы.

Тут ня лішне будзе спытаць:

— Што далі беларусам для таго, каб вывясьці іх з цьмы на сьвет?

Далі ім школу.

Разбіраючы работу гэтай школы, работу, каторую яна спаўняе за ўсе часы свайго жыцьця у Беларусі, я не скажу, што яна спаўняла назначэньне праўдзівай народнай школы. Праўдзівая народная школа павінна быць дапасаванай да характару і духу таго народу, для каторага назначэна, а не наадварот. Школа павінна здаволіваць патрэбу навукі у роднай мове і, самае важнае, яна не павінна стаяць збоку ад сямьі, не павінна закідаць зерне здрады усяго роднаго Наша цяперэшняя школа падгатаўляе узрост беларускай інтэлігенціі, такога гатунку, каторая пры далейшым сваім узросьце ўжо лёгка адрэкаецца свайго народу, бо той цэмэнт, каторы зьвязываў яе з сваім людам і краем, выкрышэн школамі.

Аб духавенстві — і першым дзелам аб праваслаўным — трэба сказаць, што яго работа непрыкметна, што яно мало дбало аб асьвеці народу і не зрабіло нічога карыснаго на гэтай дарозі. Ня гледзячы на доўгіе часы супольнаго жыцьця з народам, яно непатрапіло нават асьвяціць душы свайго парафіяніна сьветам вучэньня Хрыста, і ў душы беларуса і дагэтуль змагаюцца ўсякіе забабоны разам з евангельскай праўдай, каторая прынята цёмным чэлавекам не як нешта жывое і зразумелае, а проста як сухая форма.

Каталіцкае духавенства рабіло больш; толькі яго работа ня мела нічога супольнаго с праўдзівымі патрэбамі беларускаго народу, і гэту працу ксяндзоў барджэй можна паставіць ім у віну, чым у заслугу.

Часта прыходзіцца чуць, што беларус стаіць шмат ніжэй ад вялікаруса па свайму развіцьцю Згодзімся, што гэта праўда, і ня будзем падымаць спорку; толькі напомнім, што над вялікарусам многа працавалі яго лепшые сыны, каторые аддавалі ўсё за свой народ. Успомнім 60-ые годы, калі расейская інтэлігенція „хадзіла ў народ“, жыла з ім і працавала на яго карысць. Беларуская-ж інтэлігенція часта вырэкалася свайго народу, не хацела прызнаць яго за асобную націю. Гэта ешчэ і цяпер мы бачым сваімі вачыма.

З усяго гэтаго, што было тут казана. выходзіць, што нельга вінаваціць беларускі народ у яго цемнаце і апушчэнасьці, бо гэта будзе здзек і насьмеханьне ня толькі над народам, але і над самым сабою, над сваім ўласным неразуменьнем.

Т. Г.

## Яйцо нас збагаціць.

(*канец*).

Як бачым, дацкіе селяне яечным таварыствам падняли прыбытак ад курэй да 3 - 5 рублёў с кожнай. Аб гэтым нам і ня сьнілося. Тым часам ад нас яйкі так сама вывозяцца ў Англію і маглі б заняць там першае мейсцо па смаку яек. Трэба ведаць, што дацкаму селяніну прыходзіцца курэй трымаць зачыненнымі ў катухах, трэба круглы год карміць, бо выпускаць німа куды. Курыца нясецца „без нагулу“, корміцца лісьцямі і ўсякімі мясівамі; яйкі дацкіе ад гэтаго несмачные. Нашы куры ходзяць ўсе дні, жыруюць самі нагульваюцца не на мясіве; гэтым нашы яйкі куды смачнейшые ад другіх —бадай ці не самые лепшые Нашу курыцу трэба толькі падкарміць, а не карміць ўвесь год

Трэба і нам з'еднацца ў таварыства, ўзяць продаж яек у свае рукі, павясьці птушную гаспадарку, як паказывае навука і практыка, і тагды ад курэй наш селянін будзе мець карысці куды болей, як датчане, бо й утрыманьне бо і утрыманьне курэй ня будзе нам гэтулькі каштаваць, як тамашняму селяніну. У Палтаўскай-Харкоўскай і Варонежскай губэрні ужо завяліся яечные таварыствы, злучыліся ў хаўрус і завялі некалькі кантор дзеля збыту яек заграніцу. Англія, куды йдуць нашы яйкі, вельмі далёка ад Расеі-перавоз чыгункай да мора - пры, морам ад Варонежа да Рыгі каштуе 25 капеек с сотні яек, ды морам да Англіі капеек 10; упакоўка ў яечные скрынкі — болей 20 кап. на сотню От і маем чуць не 55 - 60 капеек на сотню страты. Але й то сябры яечных таварыств мелі ад курыцы даходу па 4—5 рублёў ў год а чыстаго прыбытку — каля двух рублёў на курыцу Гаспадар, маючы 25 курэй, меўбы каля 50 рублёў чыстаго прыбытку ў год у тры разы больш чым цяпер. Наш беларус— селянін мецьме прыбытку нават больш за украінца, бо да Лібавы нам зусім блізка: дарога чыгункаю абойдзецца зусім танна, і лішняя грыўня чы пяцізлотка на сотні яек астанецца ў нашай кішэні

Хто нам не дае з'еднацца ў яечные гурткі і таварыствы?

Як вядзецца бадай усюды, курачаю гаспадаркаю запраўляе кабеціна, вясковая наша баба, мае аб куры клопат, мае й ад прыбытку з іх хустку, спадніцу ці ешчэ што для сябе. Што небудзь ідзе і ў дом, на гаспадарства хатняе. От і бачым, што — бабы больш усяго сталі спрэчацца ды недаваць завясьці яечные хаўрусы. Не разумеюць таго, што, сьцерагучыся аддаць часць сваіх даходоў мужу, даюць вялікую часьціну прыбытку чужым — крамнікам ды перакупшчыкам. І мы ад усее душы раім нашым вясковым кабецінам, жонкам маткам, сёстрам: „Будзем дзяліцца прыбыткамі па сумленьню. Бярыце сабе большую частку — для сваіх жаночых патрэб, але не спрэчайцеся і для гаспадаркі даць часць прыбытку з яек. Яечнае таварыства — гэта як бачыця, выгода й вялікая; дык будзем разам працаваць і бараніцца ад нашых непрыяцелёў — скупшчыкоў. Ніхай нам ідзе ў кішэню тое, што мелі-б зарабіць на нас яны!“ Трэба зразумець і тое, што кабеты траццяць на сябе грошы, каторые ўсё роўна далі-б на гэтые справы іх бацькі, мужы ці браты .. Дык ці ня ўсё роўна гэта ці ён, чы яна с сваей кішэні затраціць? Ніхай кабеты хоць-бы большую частку бяруць на сябе, але ад таварыскаго торгу ешчэ часьціна прыпадзе й на гаспадарку, карысць будзе для ўсіх Вось пачынаймо закладаць агульнымі сіламі яечные гурткі: ніхай сябрамі таварыства запісываюцца і кабеты, дык і прыбытак ад гандлю яйкамі будзе іхні Дзіўнаго нічога тут німа, што кабеткі нашы будуць сябрамі таварыств. Унь ў Бэльгіі кабеты гэтак сама перш спрэчаліся, а цяпер найбольш яны й сталі сябрамі гуртков. І ад году ў год, болей і болей карыстаюць бэльгійскіе кабеты з яечнаго хаўрусу Ніхай й наша вясковая кабеціна зразумее сваю і хатнюю выгаду ад хаўруснаго руху, ніхай ня толькі не спрэчаецца, а сама падахвоціць мужыкоў нашых да хаўрусу. І тады дастатку так сама прыбудзе ў нашай вёсцы, як прыбыло яго гадоў 20 — 30 заграніцай .. Наш селянін і ад яек мецьме значную выгоду, узмацуецца ў гаспадарцы... Маленькім дзелам можна дабіцца і большаго: завясьці добрую кароўку й гатунковую свіньню. Глядзіш — і завядуцца

---

сьвет не здаволіць яго. Запрагнецца шчасьця, любошчаў, каханьня; захочэцца волі, прасторы, свабоды, і — будзе часамі за доляй па сьвеці, пакутаваць, марыць, спадзевацца і верыць.

А долі ня знойдзе нідзе і ніколі..

Тым часам жыцьцё не стаіць, яно не счэкае. Гадочкі пралятуць, праімчацца, леты сплывуць, пазьнікаюць, моў дым у паветры, як хмары у небі, і не пакінуць ні сьледу, ні знаку... Сэрцэйко сціхне, заб'ецца паволі, рызыка пройдзе, задор прамінецца, пачуцьця пагаснуць і замоўкнуць, а розум спакойна падлічыць, зрахуе ўсе дзеі, учынкі ды моўчкі пакажэ халодны свой прысуд:

— Кружыўся, нябога, на мейсцы, як змалку у стойцы, або ў бягуну *) сярод хаты...

Тады мо і ўцяміць ды будзе па часі·
Шукаючы долі, згубіў свае шчасьця!

---

На заўтра, ранютка устаўшы, першым дзелам Анцік пабег да сяброў пазухаваць і пахваліцца. І ўсюды, куды ні заходзіў ён, малые зайдросна глядзелі й маўчалі, а старые дзівіліся і хвалілі.

— Уга, уга! Дзяцюк ды годзі! падхвальвалі людзі.

Дзеля лепшаго агляду, яго ставілі задам, варочалі перадам, прасілі прайціся па хаці, потым спынялі ды загадывалі узяцца ў бокі. Анцік маўчком выробляў усе выкрутасы, толькі чмыхаў носам і саромліва міргаў вачыма. Яму аж ня добра і ўсіх шкода рабілося, што вот ён, а ня хто іншы, стаў зэзам агульнай увагі. Ен бы бажаў, каб кожын меў гэткіе порткі ды не зайдросьціў яму, а разам з ім смеяўся, радзеў, весяліўся...

У іншай хаці мацалі корт на портках пыталі, ці дорага каштуе, дзе набіралі—у Мыркі ці ў Іцкі, а распытаўшыся, азіралі здалёк ды, успляснуўшы рукамі, у голас казалі:

— А, а! Вот бо дзе хараство! Ці не жаніць цябе бацька сабраўся?!

Нацяк на жаніцьбу трошкі ні да ладу адчуваўся у вусі, але Анцік не прыслухоўваўся і не звертаў увагі. Сеўшы дзе-небудзь на лаві, абопроста стоючы з боку ля столу, ён пазіраў на ўсіх паглядам чэлавека, катораму раптам адчыніўся сьвет Божы, і ён угледзіў рэчы, якіх досі ніколі не бачыў...

---

Ды ня доўга цешыўся Анцік. Нехта пазайдросьціў яму, брыдкім вокам зірнуў і здзівіў яго порткі. Ня меў ён шчасьця спажыць іх, як сьледна,—стрэла іх прыкрыя доля, і згінулі яны ад брыдкай ганебнай сьмерці на пяты дзянёк свайго жыцьця.

Як часта сьмех наш канчаецца плачам! Як часта нашы уцехі, ласашчы на дне прыгорклы і прыгарэлы! Зазвычай, што прыемна пачнецца, дык скончыцца сумна й нядобра. Мэрам хтось сочыць за намі, зайдросьціць ды, спакусіўшы, рагочэ, сыпнуўшы у кубак жаданага трунку жменю чэмяру...

Кожная рэч, як ведама, патрэбуе датэмпаго і разумнаго ужываньня, бо ў іншым разі выйдзе не карысць і ўцеха, а сьмех і гора. Гэта датычэ усіх і ўсяго — старога і малога адзежы і начэньня. За прыклад нам ўбудзе Шуськаў Габрусь. Хлопец ён сталы не блазан дзяцюк, а вось як узяўся, за што ня ўмеў ды й ня трэ было брацца, то яшчэ й досі саромяецца на вуліцу выйсці. Людзі ходзюць, гуляюць, смяюцца, а ён сядзіць дзе-небудзь у запечку ды турбуе галаў, ломіць мазге над пытаньнем: што лепей дзесяць болек на носі, ці панскіе порткі на выпуск? Чэлавек ён ня кепскі,—шкада дзяцюка, а йшчэ горш будзе шкода, калі не сцяміць начхаць на абое, бо абое рабое.

Пятрусь даўно жадаў мець крамные порткі. Бывала ідзе по ўз вокны семінары, сэмінарысты у чорных портках на выпуск, дык ён як шыбы ня выпхне: уваткне нос,—цікуе, глядзіць, пацінаецца ды аж цмокае ад хараства і зайдрасьці. Сэмінарысты пройдзе, схаваецца, а ён—адхісьнецца ад вакна, цяжка ўздыхне, схісяне галавою ды безнадзейна прамовіць:

— Хараство!

— Не дасьцё веры, глядзець было млосна, збоку шкада было хлопца. Дзяцюк вачывідкі сохнуў, марнеў. Каб змога, здаецца, самбы купіў, або украў дзе — хай іх высмаліць з гэтымі панскімі портками, — абы дзяцюк ня нудзіўся гэтак, не марнаваў свайго жыцьця. Урэсьці фартуна, — на што ўжо бязлітосная, запанслівая кабета, а й тая злітавалася, і яна абярнулася тварам да хлопца, пасьміхнулася і пашкадавала Мабыць жэ і ў яе сціснулося сэрца ад жалю, бо на Ўласа у вечэр Габрусь трымаў паперовы пакунак, адкуль выглядалі крамные порткі ў палоскі, ды пытаў кожнаго, хто захадзіў у хату:

— Як васан гадае, дорага каштуе вось гэтакая рэч? Не, не,—вы скажэця,—як на вашу гадку?... Ня ведаецця? Га... вот-жа бачыця! Гэта, брат, ня шворэнь купіць, а тыж-ж думаў як?!.

І Габрусь цмокаў, міргаў і смеяўся, але цэны не казаў. Ен-то клаў порткі на стол, то ізноў браў у рукі ,разгортваў, вешаў, цешыўся ды зноў складаў, зноў абгортваў паперкай і завязваў ніткай Нарэсьці аддаў мацеры схаваць а тая занесла ў камору ды замкнула у кублі. Але Габрусь яшчэ доўга ня мог супакоіцца. Зашчаміўшы рукі за карк, ён крочыў па хаці, марыў, пасьміхаўся ды сам сябе цешыў у думках, як будуць зайдросьціць мне, дзівіцца й хваліць. Было шкода, што ўжо вечэр і позна, што нельга прыбрацца ды выйсьці на вуліцу, пайсці на вячоркі. Як-бы шчыра зірнула Анелька! У Габруся сэрцэ вяло і салодка дрыжэло. Ен увесь абмяк, як кісель ад вады, і думаў: «Не, цяпер брэшэш, Анелька!— годзі табе шкіліць і выскаляцца! Не мінеш ты маіх рук, — азьму, як рыбку на беразі»... А покі што пахаджаў ён па хаці ды на-паўгубы перэцінаў:

Ці я табе ні жана, Тры дні дома не была,—
Ці ні гаспадыня? Есьці не варыла.
Ці я цябе ня ўшчуваў,
Ці я не сварыўся?!

*) Бягун, колца у каторые ставяць дзіця, каб яно вучылося бегаць.

грошы і ад малака, і ад кормных падсвінакаў. Смела скажэм:

*Яйцо дасць нам сілы, яйцо нас збагаціць!*

Усім хто захочэ працаваць дзеля устройства яечных хаўрусоў, раім звярнуцца з гэтым у нашу газэту. Рэдакція скорым часам надрукуе кніжачку «Як заводзіць яечные таварыствы». Яна ўжо бадай ўся апрацавана і будзе прыслана ад мяне у рэдакцію.

**Наз. Бываеўскі.**

* * *

На горне душы я жывы верш каваў,
Мне молатам горэ служыло;
Зык песьні паўночнай у сэрцы хаваў,
І сэрцэ свой боль гаварыло...

На струнах душы жывы верш я заграў,
Насіліся рэхі далёка
Ратай пры іх шнур свой глыбей заараў
І сьлёзы туманілі вока...

**Ясакар.**

* * *

Падаўжэў ужо дзень і настала цяпло.
Сонцэ ярка на небі гарыць.
Тае сьнег на палёх і руччамі вада
С шумам з горак у рэчку бяжыць.

Разбухаюцца ўжо на ўсіх дрэвах пучкі;
Шум ажыўшаго лесу чуваць.
Птушкі з выраю к нам прыляцелі назад,
Песьні-ж іх аж у неба лецяць.

Навакол на зямлі зелянее трава,
Скрозь усё устае ада сну
І прбыбрацца сьпяшыць нейкай дзіўнай красой,
Каб спаткаць маладзіцу — вясну.

**Ю. Ф.**

# З Беларусі і Літвы.

## З Віленшчыны

**Дзісна,** *Віленск. губ.*

Ягомасць П. Б. абмыліўся, ці можэ добра не разведаўся пра здарэньня у Дзісьне 24 лютаго.

Кабета была дома не адна, а з нявесткай і ў гэту пару прышлі у двох гарадавые за доўгам нявесткі. Гарадавік Мішута узяўся за гадзіннік старой, а яна стала недаваць. Тады Мішута распарадзіўся каб другі яго таварыш падзержаў рукі старой, а ён атабраў гадзіннік. Старая ужо відаць адвыкла ад няняк дык яна і неўпадабала такой работы: пасьля выхаду гарадавых дзьве гадзіны спусця— памёрла. Па звычаю яе ўскрывалі, былі пры гэтым панятые. Панятые відзелі сінякі на руках, рану у баку ад удару гадзіннікам і падзертую на ей адзежу. А с чаго яна памерла дык яны ня ведалі, велама-ж не дактары. Пасьля ўскрыцьця паліція забараніла гаварыць, што кабета забітая, а што яна памёрла са злосьці. Яно мусі так і было, бо каб кабета была забітая дык Мішута пэўне-б не служыў гарадавым, а то ён як служыў так і служыць.

*Б. С.*

## З Вітэбшчыны.

**Хоцькоўшчына** *Вітэбск. губ. Леп. павету.*

Гадоў 20 таму назад двор Хоцькоўшчыну купілі беларусы каталікі, каторые прыехалі сюды з Віленск. губ Дзісненскаго пав; усіх гаспадароў іх тут ёсць 5, палавіна двору належыць да Чарновага, а другая палавіна да астатніх чатырох гаспадароў Банькоўскіх. Жылі гэтые гаспадары паміж сабою згодна датуль, покі адзін з іх Нікодым Банькоўскі служыў у ваеннай службе, але як толькі вярнуўся Кодзік с салдатаў, падзяліўся з братам Віктарам і стаў ґаспадарыць, дык з тых пор і пачалося ліха у Хоцькаўшчыне Нікодым узяўшыся за гаспадарку стаў заўсёды шукаць здарэньня, каб к'катораму небудзь с суседзяў прычапіцца бяз прычыны, пасварыць аднаго з другім, зрабіць шкоду другому і інш. Цярпліва перэнасілі суседы несправядлівые напады са стараны Нікодыма, бо ведаўшы яго неспакойный характар не хацелі з ім чэпацца; дык мала усяго гэтаго было Нікодыму пачаў ён судзіцца с кожным гаспадаром; досыць было катораму з іх прайці вечэрам каля двору Кодзіка, як той ужо і крычыць: а! гэта ты маю хату хацеў спаліць! і на другі дзень падае ужо у суд. Другім разам адзін з гаспадароў паставіў пастку на лісоў, увідзіў гэта Нікодым і ужо ушчынае справу аб тым, што гэта пастка не на лісіцу пастаўлена, а каб яго сабаку забіць і ізноў у суд; так пастаянна судзіцца Нікодым ня толькі з жыхарамі Хоцькаўшчыны, але і с кожным к'каму талькі можна прычапіцца... — А куды гэта едзе Кодзік?—пытаюць людзі, — суд! У а кудыж больш ён можэ ехаць. так ужо у нас к гэтаму прывыклі што іначэй і не атказываюць. За тое кожнае сьвята едзе ён на мшу у касьцёл і абвешаный ружаньцамі і шкаплерамі дужа шчыра моліцца, а як толькі выйдзе с касьцёла, то зара пачынае лаяць ксендза за тое, што той на казаню навучаіць каб яго парафіяне згодна паміж сабой жылі. Адным словам крэпка тут усім насаліў Нікодым, але больш за ўсіх пападае ат яго Чарновому, катораму ён заздросціць што у таго зямлі больш чым у яго, дзеля гэтага ён разам с сваім братам Віктарам робіць старэньне, каб як небудзь выжыць Чарновага з Хоцькаўшчыны, зямелька каб ім асталася. Як толькі Чарноў куды небудзь атлучыцца, дык браты зараз у лясок яго і вырубяць нескалькі дзеравін, ці ешчэ якую шкоду зробюць яму. А трэба сказаць, што Чарноў чэлавек спакойны, працавіты, нікога ня скрыўдзіць і судоў ня любіць, дык Нікодым і карыстае з гэтаго. На тым тыдні, калі Чарноў паехаў на два дні у Вітэбск, Кодзік скарыстаў з гэтага і вырубаў у яго лесі кала ста тоўстых дзеравін, мусі ён думаў што і гэта яму так сойдзе, але на гэты раз і Чарноў не дараваў яму гэтага прыступка, пазваў урадніка, апанятаваў шкоды і падае у суд; хаця Хоцькаўцы ня дужа нешта веруць у гэта, каб Кодзіка можна было засудзіць, пагаварываюць, што ён і з гэтай справы выйдзе чысты як і з іншых.

Няужож праўды німа на сьвеці? няўжо ешчэ доўга будзе крыўдзіць Кодзік сваіх суседаў і не панясе кары за свае праступленьня?

*Сініца.*

# З усіх старон.

### Атруцьця сярод работнікоў.

Увагу ўсей Расеі, звярнулі на сябе апошніе здарэньня на фабрыках у Рызе і Пецярбурзе. Сперша на гумілястыкавых фабрыках „Праваднік", а пасьля і на другіх фабрыках, большай часьцю гумілястыкавых і тутунавых, пачалі пры рабоці млець работніцы і работнікі.

Найчасьцей раніцай аказывалі ся прыметы атручэньня, а пасьля людзі сотнямі млелі. Само сабой гэта выклікала вялікі неспакой сярод работнікоў і яны пачалі пратэставаць проці варункоў працы, каторые да гэтаго даволзяць гаротны народ. Соціял-

Бізуном раз лупцаваў,
Тры да-да, дай-да!

Краўчыха Агата гэтак сама на Ўласа была на месьці і бачыла, як Габрусь таргаваўся. На заўтра забегшы да нас пазычыць агню, яна нам сказала, што Габрусь заплаціў за свае порткі чатэры злоты і шэснанцаць грошы.

Дачэкаўшы першаго свята, Пятрусь прыбраўся, аглядзеўся ў люстэрку ды выйшоў на спацыр. Было яшчэ рана, нават не званілі ў цэркаў...

Спацыр пекная рэч і паспацыраваць ніколі ня шкодзіць. Гэта карысна для здароўя а дактарэ—дык заўсюды раяць пагуляць часіну па вольным паветры. Але калі ты узяўся спацыраваць дык спацыруй на здароўе і трымайся, будзь ласкаў, надуманай мэты. Так-жэ сама трэ памятаць, што кепска той робіць, хто, задраўшы нос, у дзень зоры лічыць. Зоры ніхай будуць зоры, а ты не забывайся пад ногі глядзець. Капейкі мо' й не знайдзеш, дык, напэўна, не спаткнешся ды ня гупнеш, як гляк, воб зямлю. А то вось—ці-ж гэта хораша?—пытаюць дзеткі у мацеры:

— Мамка! Хто табе губу разбіў?

— Ат, ехаў раззявяка некі, ды аглобляю ў рот..

Дык ласьня кожнаму уталкуеш? Вот і Габрусь, і не дурны хлопец, здаецца, а тым часам кроку не ступіў, каб не спыніцца ды не азірнуць сябе з усіх бакоў. Яму здавалося, што порткі цісНуць, задзіраюцца, — лезуць у верх, фалдуюцца і не лежаць як трэба. Дык ён нагінаўся, тузаў, абцягваў, разгладжваў складкі, папраўляў паясьніцу ды, азірнуўшыся, памаленьку крочыў далей. Такім робам дайшоў да студні. Там трапіў на лёд, пасьлізнуўся, ня ўстояў і бразнуўся воб зямлю. Рэч вядомая, далікатны корт порткаў ня вытрымаў: порткі трэснулі і разляцеліся.

Якраз дзяўке чэрпалі воду, і іх рогат. як гром неўспадзеўкі, агалушыў Габруся да рэшты. Каб была тут гразь, — ён бы напэўна трэйчы перэвярнуўся на зло ўсяму сьвету. Але пад ім быў лёд; ён лежаў як жэрдка, пасярод вуліцы заплюшчыў вочы і не хацеў ўставаць. Тымчасам Анелька—сакатуха не чэкала. Яна кінула вёдры ды ухапіўшыся за жывот, як пенька ня трэсьне, рагатала над самым вухам Габруся.

— Уставай Габрусь, ніхай цябе цяміць крычала яна,—коні наедуць!.

Габрусь крошку папяўся, прыўстаў, потым сеў, павёў непрытомна вачыма, заківаў галавою ды распачліва прамовіў:

— Вот табе і партэ—эчкі!

---

Анціку — дык ліха надарылося з іншаго боку.

Матка мэрам што ведала, як казала, прымераючы порткі:

— Глядзі, сынок, шануйся! Даглядай, абы дзе ня кідай...

Дык што-ж ты зробіш? Суджэнаго не мінеш, а што прамінуло ня вернеш...

Покі курэўся хмель новай навіны, Анціку было хвацка у портках, — прынамсі, ня чуўся, каб дзе што муляло або заміналo. Потым.. Вот кажуць, што порткі спрытная рэч,— не замінаюць, а Анціку яны вот дзе сядзелі.

Перш-на перш гэтые гузікі спад цяжкамі... Яны адлеталі кожнаго дня, а той масянжовы, напрыклад, згубіўся на заўтра. Ні раз прыходзілося затуляць рукамі і трымаць у руках, покі не знаходзіла матка часу прышыць яму новые. Ні раз на бягу порткі спускаліся, путалі ногі і—Анцік ляцеў воб зямлю і разбіваў сабе нос. Пробаваў бацька рабіць яму гузікі з дзерэва. Гэтые гузікі не прышываюцца, а іх прывязуюць да паясьніцы шпагатаю, пракалоўшы дзьве дзіркі верацяном. Нічога не памагала—гузікі ламаліся, а шпагат заставаўся.

У канцы порткі пачалі бryндацца, мокнуць, карэць і дапекаць у гульнях. Бывала заганяеш свінку, даўней хоць падолам прыкрыеш, а ў портках трасцу змахлюеш. А вот як Каўгар высьцябаў яго крапівою за грушкі, — хто-ж быў вінен калі ня порткі? Ен саўсім ужо ўцёк, дык чорт надаў зачапіцца за кол калошаю. І то-ж, падла, бьецца:—праз тры дні пякло, як махнушаю.

Дык на час гульняў, а то й так пад гарачы час, Анцік скідаў к чортавай матары порткі ды вешаў дзе-небудзь поблізку на плоці. Гэтак-жэ зрабіў ён і на той раз, як трапіў на іх дворны кнораз (кнур). Гэты кнораз жыве гадоў дзесяць і мусі німашака ваўкоў на яго ў лесі. І ня колюць яго, і ня рэжуць яго, і чартэ іх ведае, што яны думаюць сабе. Не баіцца ён нікога й нічога. Ломіць платэ, варочае парканы, лазіць у шкоду і німа на яго справы на сьвеці Хадзілі скардзіцца, але акоман і вухам не вядзе.

— Загарадзі, кажэ, лепей—ня ўлезе!

Гарадзілі і чаго не чынілі,—дык хіба жалезам, бо й мур яго не стрымае. Летась у восень залез к Чурылі ў капусту і зматлашыў да званьня. Разсердаваны Чурыла хацеў застрэліць, нават стрэльбу набіў, але дзядзька Мацюта адрадзіў.

— Ніхай ён — кажэ — сам лепей здохне, а ты стрэльбу кінь і не чапайся ..

Вось гэты кнораз сцягнуў с плоту Анцікавы порткі і пашматаў на кусочкі, а чырвоную паясьніцу с падцяжкамі завалок к Чурылі на сметнік.

Анцік горка плакаў, а ў хаці шкілілі.

— Дык як ты згубіў свае порткі?

— Каб-жэ згубіў, а то свіньні з'ьелі!

— Бадай ты скіс, сынку, бадай ты! дадаў і бацька. — Што-ж цяпер рабіць? За цябе-ж ні водная дзеўка замуж ня пойдзе.

---

На заўтра матка наўмысля засталася дома ды пашыла яму новые порткі, — з новаго, моцнага, як скурат, шаражу. Цяпер яна не баялася, што Анцік згубіць.

**Язэп Лёсік.**

